# На выстаўцы ў бібліятэцы імені Леніна

У Дзяржаўнай бібліятэцы імені В. І. Леніна нядаўна адкрыта пастаянная выстаўка «Вялікая Айчынная вайна ў літаратуры».

На выстаўцы ёсць 13 аддзелаў: гераічнае мінулае рускага народа, героі Айчыннай вайны, народныя мсціўцы, гарады-героі, комсамол у баях за Радзіму, совецкія жанчыны ў Айчыннай вайне, адзінства фронта і тыла і іншыя. Тут сабраны тысячы кніг, фотаздымкі, ілюстрацыі, партрэты, плакаты і асобныя дакументы.

Кніга таварыша Сталіна «Аб вялікай Айчыннай вайне Совецкага Саюза» знаходзіцца ў цэнтры выстаўкі, у розных выданнях. Побач падабраны ўсе прапагандысцкія матэрыялы, неабходныя для вывучэння кнігі таварыша Сталіна. Тут-жа ёсць літаратура аб арганізатарах Чырвонай Арміі В. І. Леніне, І. В. Сталіне, аб вялікім палкаводцу — Вярхоўным Галоўнакамандуючым І. В. Сталіне.

У аддзеле «Гераічнае мінулае рускага народа» ёсць многа гістарычнай і мастацкай літаратуры аб вялікіх рускіх палкаводцах—Александру Неўскім, Дзімітрыю Данскім, Пажарскім, Мініне, Сувораве, Кутузаве. Цікавыя літаграфіі, як «Лядовае пабоішча», «Куліковская бітва», «Барадзінская бітва» і іншыя дапаўняюць гэты аддзел і яшчэ больш яскрава паказваюць гістарычныя бітвы з чужаземнымі захопнікамі за незалежнасць нашай Радзімы. У гэтым аддзеле выстаўлены кнігі аб Фрунзе, Чапаеве, Пархоменка, Шчорсе і другіх.

Вялікае месца займае на выстаўцы мастацкая літаратура, прысвечаная Айчыннай вайне. Тут ёсць кнігі лепшых совецкіх майстраў мастацкага слова: Гросмана «Народ бяссмертны», Собалева «Марская душа», Эрэнбурга «Вайна», Гарбатава «Апавяданні аб салдацкай душы», Шолахава «Яны змагаліся за Радзіму», зборнікі К. Сімапава і многія іншыя кнігі.

Асобна сабраны мастацкія творы беларускіх пісьменнікаў аб вялікай Айчыннай вайне. Сярод іх кнігі, надрукаваныя Белдзяржвыдавецтвам: Я. Купалы «Вершы аб Радзіме», А. Куляшова «Сцяг брыгады», М. Машары «Беларусь», А. Стаховіча «Шумяць лясы», М. Танка «Япук Сяліба» і мастацкія зборнікі «Беларусь у агні», «Беларусь змагаецца».

Увагу звяртаюць 15 літаграфій мастака Чэхава, якія знаходзяцца ў аддзеле «Зладзеянні нямецка-фашысцкіх разбойнікаў».

На выстаўцы прадстаўлен аддзел «Героі Айчыннай вайны». Сотні кніг аб няўміручых подвігах сыноў совецкага народа дапоўнены шматлікімі фотаілюстрацыямі і карцінамі. У аддзеле «Народныя мсціўцы» шырока паказан партызанскі рух у Беларусі.

Істотным недахопам выстаўкі з'яўляецца адсутнасць раздзела аб палкаводцах Айчыннай вайны. Няма і карты, якая-б яскрава паказвала гераічны шлях нашай Чырвонай Арміі ад берагоў Волгі да Одэра і далей, на якой было-б відаць, што совецкія воіны ўжо блізка падышлі да Берліна.

Выстаўка ў бібліятэцы імені Леніна, не гледзячы на некаторыя недахопы, дапаможа нашым партыйным кадрам, асабліва прапагандыстам, навуковым работнікам, студэнтам, а таксама кожнаму грамадзяніну нашай Радзімы глыбей пазнаёміцца з гісторыяй вялікай Айчыннай вайны, са шматлікімі матэрыяламі аб вялікай гістарычнай місіі Чырвонай Арміі.